Голас Радзімы

№ 52 (1986)
25 снежня 1986 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.

З НАДЫХОДЗЯЧЫМ НОВЫМ ГОДАМ!

Мінск. Плошча Леніна.

Фота С. КРЫЦКАГА.



ЗАЯВА САВЕЦКАГА ЎРАДА

Савецкі ўрад выступіў з Заявай, у якой зноў заклікае ЗША ўзяць прыклад з СССР і адмовіцца ад правядзення ядзерных выбухаў.

Мінула амаль паўтара года з таго часу, гаворыцца ў Заяве, як Савецкі Саюз, у імкненні садзейнічаць спыненню небяспечнага спаборніцтва ў нарошчванні ядзерных арсеналаў і жадаючы падаць добры прыклад іншым ядзерным дзяржавам, прыняў рашэнне спыніць у аднабаковым парадку любыя ядзерныя выбухі і заклікаў ЗША далучыцца да гэтай яго акцыі.

Аднак, як вядома, адміністрацыя ЗША не падтрымала савецкую мірную ініцыятыву. За час дзеяння мараторыя, пакуль на савецкіх палігонах панавала цішыня, ЗША правялі 20 афіцыяльна аб'яўленых і 4 неаб'яўленыя выпрабаванні ядзернай зброі.

Ва ўмовах, калі Злучаныя Штаты ўпарта працягваюць ажыццяўляць сваю праграму ядзерных выпрабаванняў у мэтах стварэння новых ядзерных узбраенняў і іх нарошчвання, Савецкі Саюз не можа бясконца праяўляць аднабаковую стрыманасць. Склалася сітуацыя, працяг якой пагражае нанясеннем сур'ёзнай шкоды бяспецы СССР і яго саюзнікаў.

Пасля глыбокага і ўсебаковага разгляду гэтага пытання савецкае кіраўніцтва лічыць неабходным заявіць наступнае.

Першае. Савецкі Саюз зноў прапануе неадкладна пачаць поўнамаштабныя перагаворы аб поўнай забароне ядзерных выпрабаванняў. Ён гатоў на правядзенне такіх перагавораў у любым саставе і на любым форуме, зразумела, з удзелам Злучаных Штатаў. У ходзе гэтых перагавораў павінны быць вырашаны і пытанні кантролю такім чынам, каб было забяспечана надзейнае выкананне пагаднення накошт гэтага. У працэсе перагавораў аб поўнай забароне ядзерных выбухаў Савецкі Саюз быў бы гатоў дагаворвацца і аб паэтапным вырашэнні гэтай задачы, маючы на ўвазе ратыфікацыю савецка-амерыканскіх дагавораў 1974 і 1976 гадоў і ўвядзенне прамежкавых абмежаванняў на колькасць і магутнасць ядзерных выбухаў.

Другое. СССР гатоў прытрымлівацца свайго мараторыя і далей. Аднак ён адновіць ядзерныя выпрабаванні пасля першага ж ядзернага выбуху ЗША ў надыходзячым годзе.

Трэцяе. Калі ЗША спыняць ядзерныя выпрабаванні, СССР у любы дзень і месяц будзе гатоў на аснове ўзаемнасці спыніць рэалізацыю сваёй праграмы такіх выпрабаванняў.

Рашэнне аб спыненні Савецкім Саюзам свайго мараторыя пасля першага ядзернага выбуху ЗША ў надыходзячым годзе — вымушаная мера, дыктуемая выключна інтарэсамі бяспекі. СССР застаецца перакананым прыхільнікам поўнага спынення ўсіх ядзерных выпрабаванняў як важнейшай першачарговай меры ў справе дасягнення галоўнай мэты — стрымлівання гонкі ядзерных узбраенняў, іх наступнай поўнай ліквідацыі. Як і раней, СССР будзе энергічна дабівацца дасягнення гэтай мэты. Ён перакананы, што яго пазіцыя ў гэтым пытанні сустрэне належнае разуменне і атрымае падтрымку з боку ўсіх міралюбівых сіл нашай планеты, гаворыцца ў Заяве Савецкага ўрада.

ПЕРШЫ ГОД ПЯЦІГОДКІ: ЯКІЯ ВЫНІКІ?

ДВАНАЦЦАТАЯ ПЯЦІГОДКА (1986—1990) ЗАЙМАЕ АСАБЛІВАЕ, КЛЮЧАВОЕ МЕСЦА Ў ПЯТНАЦЦАЦІГАДОВАЙ ПРАГРАМЕ РАЗВІЦЦЯ САВЕЦКАГА ГРАМАДСТВА, ПРЫНЯТАЙ XXVII З'ЕЗДАМ ПАРТЫІ. АД ТАГО, ЯКУЮ АСНОВУ МЫ ЗАЛОЖЫМ У ГЭТЫ ПЕРЫЯД, БУДЗЕ ЗАЛЕЖАЦЬ ПОСПЕХ УСЁЙ НАШАЙ БУДУЧАЙ РАБОТЫ.

НА ПРАЦЯГУ ГОДА МЫ РАСКАЗВАЛІ ВАМ, ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ, ПРА ТЫЯ ЗМЕНЫ, ЯКІЯ АДБЫВАЮЦЦА Ў ПАЛІТЫЧНЫМ І САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫМ ЖЫЦЦІ НАШАЙ РЭСПУБЛІКІ. ЦЯПЕР, КАЛІ 1986-ТЫ, СТАРТАВЫ ГОД ПЯЦІГОДКІ, ЗАВЯРШАЕЦЦА, МОЖНА ПАДВЕСЦІ ПЕРШЫЯ ВЫНІКІ.

КАРЭСПАНДЭНТ «ГОЛАСУ РАДЗІМЫ» ПАБЫВАЎ У САВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БССР І ЎЗЯЎ ДВА КАРОТКІЯ ІНТЭРВ'Ю.

Вячаслаў КЕБІЧ,
намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР, старшыня Дзяржплана рэспублікі:

«ПРАБЛЕМА ЯКАСЦІ — У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ»



— Вячаслаў Францавіч, як бы вы ахарактарызавалі вынікі дзейнасці прамысловасці нашай рэспублікі ў 1986 годзе?

— Мы ў добрым рытме пачалі гэты год і паспяхова яго завяршаем. Сёлета будзе атрыманы самы высокі за 80-я гады рост нацыянальнага даходу і прамысловай вытворчасці. За адзінаццаць месяцаў аб'ём прамысловай вытворчасці павялічыўся на 7 працэнтаў, прадукцыйнасць працы ўзрасла на 6,5 працэнта. Найбольш дынамічна, апераджальнымі тэмпамі развіваліся галіны, якія вызначаюць навукова-тэхнічны прагрэс ва ўсёй народнай гаспадарцы,—машынабудаванне і радыёэлектроніка, металаапрацоўка і прыборабудаванне, хімічная і нафтахімічная прамысловасць.

Пачалася рэканструкцыя і тэхнічнае пераўзбраенне многіх прадпрыемстваў і аб'яднанняў. У цэхі прыходзіць новая, больш высокапрадукцыйная тэхніка і абсталяванне, прагрэсіўная тэхналогія. Цяпер у прамысловасці нашай рэспублікі дзейнічае больш за 500 робататэхнічных комплексаў, 49 гібкіх вытворчых сістэм. У якасці прыкладу, дзе паспяхова вырашаюцца праблемы мадэрнізацыі вытворчасці, можна назваць Гомельскі станкабудаўнічы завод імя Кірава. На прадпрыемстве распрацавана дэталёвая праграма тэхнічнага пераасначэння, якая была абмеркавана і падтрымана рабочым калектывам. Гомельскія станкабудаўнікі паставілі перад сабой мэту да канца пяцігодкі павялічыць аб'ём вытворчасці больш чым у два разы і дамагчыся, каб уся прадукцыя завода адпавядала вышэйшаму сусветнаму ўзроўню. Праблема якасці вылучаецца сёння на першы план усёй нашай практычнай дзейнасці па перабудове эканомікі.

— Чым гэта выклікана?

— Само жыццё ставіць пытанні якасці ў цэнтр перабудовы. Савецкія вырабы павінны ўвасабляць у сабе апошняе слова навуковай думкі, адпавядаць вышэйшым тэхніка-эканамічным, эстэтычным і іншым патрабаванням, быць канкурэнтаздольнымі на сусветным рынку. Толькі праз высокую якасць, лепшую ў свеце прадукцыю, новую тэхніку і тэхналогію мы зможам дасягнуць рэальнага паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

З 1 студзеня 1987 года на 1 700 савецкіх прадпрыемствах, у тым ліку на 86 беларускіх, уводзіцца дзяржаўная прыёмка прадукцыі. А гэта значыць, што ўсе вырабы, якія яны выпускаюць, акрамя ўнутрызаводскага кантролю, будуць праходзіць яшчэ і пазаведамасны. Праведзеныя эксперыменты паказалі, што новы парадак можа стаць магутным рычагом, які паскорыць вырашэнне адной з найбольш актуальных на сённяшні дзень праблем нашай эканомікі.

— А як гэтыя змены ў эканоміцы адбіваюцца на ўзроўні жыцця людзей?

— Эфектыўна развіваецца эканоміка — расце нацыянальны даход рэспублікі. А прыкладна тры чвэрці яго прыросту накіроўваецца ў нас на павышэнне дабрабыту народа. Зразумела, што пазітыўныя зрухі ў эканоміцы адбываюцца не самі па сабе, а дзякуючы намаганням людзей, канкрэтных работнікаў. Яны ствараюць новую тэхніку, укараняюць перадавую тэхналогію, імкнуцца выпускаць больш прадукцыі і лепшай якасці... Значыць ім выгадна працаваць так, працаваць эфектыўна. У чым выгада? Папершае, расце заработная плата. Па-другое, усё гэта прама звязана з шырокім укараненнем новага гаспадарчага механізму, які стымулюе высокаэфектыўную работу: рытмічна працуе прадпрыемства — расце яго прыбытак, а значыць і адлічэнні сродкаў на развіццё сацыяльнай сферы. А гэта — новыя кватэры, дзіцячыя сады, прафілакторыі, пуцёўкі ў санаторыі і дамы адпачынку... Карацей кажучы, як мы будзем працаваць, так мы будзем і жыць.

Ягор СУХАРУКАЎ,
першы намеснік старшыні Дзяржаўнага аграпрамысловага камітэта БССР:

«НАШЫМ КАДРАМ ПА СІЛАХ НОВЫЯ ЗАДАЧЫ»



— Сёлета ў кіраванні аграпрамысловага сектара нашай эканомікі адбылася радыкальная рэформа. У чым, коратка, яе сутнасць?

— Сутнасць перамен заключаецца ў тым, што ўсе калгасы і саўгасы разам з прадпрыемствамі ліквідаваных міністэрстваў (сельскай і плодаагароднінай гаспадаркі, харчовай і мясамалочнай прамысловасці, сельскага будаўніцтва, а таксама службы па вытворча-тэхнічнаму забеспячэнню вёскі) складаюць цяпер адзіную арганізацыйна-тэхнічную структуру, якая кіруецца Дзяржаўным аграпрамысловым камітэтам (Дзяржагрпрам). Яму падначалены і ўваходзяць у яго сістэму і іншыя міністэрствы, дзейнасць якіх напрамую звязана з сельскай гаспадаркай. Аграпрамысловы комплекс стаў фінансавацца, планавацца і кіравацца як адзінае цэлае.

— І што гэта дало?

— Сама па сабе арганізацыйная перабудова, якой бы яна ні была важнай, гэта толькі першы крок на шляху да стварэння высокаэфектыўнай сельскай гаспадаркі. Многае тут залежыць ад людзей, іх умення гаспадарыць у новых умовах, якія адкрываюць шырокі прастор ініцыятыве і сацыялістычнай прадпрымальнасці. Калгасы і саўгасы павінны стаць сапраўды самастойнымі прадпрыемствамі, якія дзейнічаюць на прынцыпах самаакупнасці і самафінансавання.

Год работы паказаў, што нашым кадрам па сілах новыя задачы інтэнсіфікацыі сельскагаспадарчай вытворчасці. Сёлета рэспубліка атрымала рэкордны ўраджай бульбы —210 цэнтнераў і караняплодаў — 471 цэнтнер з гектара. Сабрана па 25 цэнтнераў збожжа. Закупкі малака ўзраслі на 7 працэнтаў, мяса — на 8. Надоі малака на карову ў многіх гаспадарках рэспублікі дасягнулі ўзроўню 3 500—4 000 кілаграмаў. Назіраецца да гэтага рубяжа і астатнія калгасы і саўгасы.

Добрыя ўраджаі ў полі, прыбаўкі на фермах далі магчымасць больш поўна забяспечваць насельніцтва прадуктамі харчавання.

— Цікава, якую колькасць асноўных прадуктаў спажывае сёння кожны з нас?

— Прыкладна столькі, як у самых развітых краінах свету. У год на душу насельніцтва ў рэспубліцы спажываецца 70 кілаграмаў мяса, 399 — малака, 131 — хлеба, 185 — бульбы, 81 — гародніны, 45 — кілаграмаў цукру і 315 штук яек. Трэба адзначыць таксама, што ўжо на працягу многіх гадоў рознічныя цэны на асноўныя прадукты застаюцца ў нас нязменнымі...

— Але вернемся назад у вёску. Што змяніў 1986 год у характары працы вяскоўцаў, у іх жыцці?

— Сёлета быў зроблены значны крок па шляху механізацыі сельскагаспадарчай працы, умацавалася матэрыяльна-тэхнічная база гаспадарак. У калгасы і саўгасы рэспублікі было пастаўлена амаль 15 тысяч трактароў, 11 тысяч грузавых аўтамабіляў, шмат іншай тэхнікі. Праца вяскоўцаў набывае ўсё больш індустрыяльны характар, і ў многіх нашых гаспадарках яна ўжо мала чым адрозніваецца ад працы прамысловых рабочых.

Значнае развіццё атрымала сацыяльная сфера вёскі. За кошт усіх крыніц фінансавання было пабудавана 94 тысячы дамоў сядзібнага тыпу. Актыўна вялося будаўніцтва школ, дзіцячых садоў, медыцынскіх устаноў, гандлёва-бытавых, спартыўных і культурных комплексаў. Зразумела, гэта адбілася і на вонкавым абліччы беларускіх вёсак, іх добраўпарадкаванасці.

УЛАДЗІМІР КОТАЎ—ПАРТЫЙНЫ ЛІДЭР РАЁНА

ІСЦІ ДА ЛЮДЗЕЙ



ШАША Гомель — Лоеў праходзіць праз Марс. На прыпынку ў аўтобус увайшла марсіянка, жанчына гадоў сарака пяці, якой я з прыемнасцю прапанаваў побач з сабой вольнае месца.

Гэта не пачатак фантастыкі, бо Марс — не планета, а, як павінны памятаць нашы пастаянныя чытачы (пра гэта ўжо расказвалася на старонках «Голасу Радзімы»), — невялічкая вёсачка на Палессі, якая мае такую дзіўную астранамічную назву.

Разгаварыліся. Пра надвор'е — стаяла шэрая туманная раніца, так характэрная для каляндарнай пары позняй восені і ранняй зімы на Беларусі; пра міжнародныя, не вельмі радасныя пакуль падзеі—няма, відаць, на Зямлі такога чалавека, якога б не хвалявалі сёння пытанні вайны і міру; і, вядома, пра тутэйшае жыццё. Марсіянка ехала ў райцэнтр на працу. Далекавата, аж дваццаць адзін кіламетр туды. Ды назад столькі ж. І штодзённа. Паспачуваў я і спытаў:

— А ў саўгасе хіба няма чаго рабіць? Рабочай сілы лішак?

— Ёсць, канешне. І рукі мае не лішнія, — пачуў у адказ. — Толькі хворая я, не для саўгаснай (у полі ды на ферме) работы. Вось каб адкрылі швейны цэх у нас, як у адной гаспадарцы на Міншчыне — па тэлевізару бачыла, — было б выдатна. Работа па маім здароўі.

— Выходзіць, не клапоцяцца тут пра вас ні саўгасныя, ні раённыя кіраўнікі. Першы сакратар райкома партыі, напрыклад?

Падумалася, што жанчына падтрымае напрамак маіх думак. Пачне скардзіцца на кіраўнікоў. Беларуская душа адкрытая і звычайна выпадковаму спадарожнаму чалавеку ўсё да нітачкі выкладзе. А тое, што трапляюцца ў нас падчас чэрствыя, глухія да людскіх патрэб кіраўнікі — з'ява, на жаль, яшчэ не звышрэдкая.

І... памыліўся. Не падтрымала. Наадварот, далікатна апратэставала.

— Як не клапоцяцца? Клапоцяцца. І, прыкладам,—сам Уладзімір Уладзіміравіч. Аб гэтым тут вам усе людзі скажуць.

— А хто такі Уладзімір Уладзіміравіч?

— Ды Котаў, першы сакратар райкома.

Так я «выйшаў» на свайго героя. І жанчына ўзялася расказваць. Пра тое, чаго не было і што з'явілася пры Котаве. Пра новыя хаты, якія часта, як грыбы, вырастаюць цяпер у навакольных сёлах. Пра акультураныя палі — уздоўж іх, густа зарослых раней астраўкамі хмызу, бег зараз аўтобус. Пра жывёлагадоўчыя фермы, на якіх з'явіліся тэлевізары, колерамузыка для моладзі, фізіятэрапеўтычныя кабінеты, аснашчаныя стацыянарнай медтэхнікай, дзе можна праходзіць курс лячэння лічы што проста на рабочым месцы.

У час шматлікіх паездак па рэспубліцы тэлевізары на фермах мне ўжо даводзілася бачыць, а вось пра колерамузыку ды фізіятэрапеўтычныя кабінеты, прызнаюся, чуў упершыню. Але праўдзівасць і шчырасць марсіянкі, простай вясковай жанчыны, не вы[illegible]кала сумнення. Яна расказва[illegible] расказвала.

Ужо ў Лоеве, выйшаўшы з аўтобуса, я спытаў перад тым як развітацца:

—А скажыце, да хвалюючай асабіста вас праблемы — [illegible]вейных цэхаў — дабяруцц[illegible]

— Дабяруцца. Несу[illegible]нна дабяруцца. Не ўсё ж адразу...

НА КАРЦЕ Беларусі Лоеў сярод іншых гарадоў вылучаецца не назвай, а перш за ўсё сваім месцазнаходжаннем. Побач спляліся ў вузельчык тры хвалістыя сінія стужкі. Днепр, зліўшыся з Сожам, выйшаў пераможцам — захаваў і далей сваю назву. Па ім у гэтым месцы праходзіць мяжа дзвюх рэспублік СССР. Па правы бок — Беларусь, па левы — Украіна.

Ад сівога Дняпра да цэнтра старажытнага Лоева не больш... ста крокаў. Хвіліна хадзьбы. Тут у цэнтры, на невялічкай, але ўтульнай плошчы, стаяць пад чырвонымі сцягамі два галоўныя будынкі горада: выканаўчага камітэта раённага Савета народных дэпутатаў — органа Савецкай улады і раённага камітэта Камуністычнай партыі Беларусі.

У райком партыі я заходжу следам за пажылым дзядзькам. Па ўсім відаць, інвалідам: марудна адольвае ён зямныя метры, прыпадаючы на правую нагу. Абысці — няёмка. Параўняўшыся, пытаюся, зрабіўшы досыць зразумелы ківок галавой: «На вайне?»

— На ёй, траклятай, — уздыхае дзядзька. — Дваццаць дзевятага сакавіка сорак другога года пад Ржэвам. Гэта ў Расіі. Не даводзілася бываць у тых мясцінах? Прыгожыя, не горш за нашы. Там ля вёскі Назараўка і скончылася для мяне вайна. А сёння вось надумаў да Уладзіміра Уладзіміравіча схадзіць. Можа хто з аднапалчан, баявых сяброў, напісаў, шукае?.. На імя першага сакратара з усіх куткоў краіны ветэраны пішуць...

ПЕРШАЕ ўражанне аб Уладзіміры Котаве, калі я зайшоў у кабінет, было далёкім ад таго, якім малявала яго маё ўяўленне. Спадзяваўся ўбачыць партыйца-кіраўніка, энергічнага, эмацыянальнага. А сядзеў за сталом ціхі, амаль пануры, сярэдніх год чалавек. Але вось ён падняўся, прайшоўся па кабінеце, вымавіў некалькі фраз... Уражанне імгненна змянілася. І агонь унутры мне ўбачыўся, і прыроджаная парывістасць, і цэлы сажань у плячах, як у многіх карэнных палешукоў...

...Перш чым узначаліць Лоеўскую партыйную арганізацыю вясною восемдзесят трэцяга, яму давялося прайсці вялікую школу жыццёвай мудрасці і партыйнага вопыту. Мяркуйце самі. У шаснаццаць гадоў студэнт аддзялення плодаагародніцтва і вінаградарства Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. Пасля сканчэння яе аграном-насеннявод Лельчыцкага раённага ўпраўлення сельскай гаспадаркі, галоўны аграном роднага саўгаса «Астрагляды», што на Брагіншчыне, і, нарэшце, адзін з галоўных спецыяліста[illegible] Брагінскага райвыканкома [illegible] і ўступіў у Камуністычную партыю Савецкага Саюза. Было гэта ў 1973-м.

А праз тры гады Уладзіміру Котаву прапанавалі партыйную работу — ін[illegible]руктарам Гомельскага абко[illegible]артыі. Затым яго выбралі др[illegible]м сакратаром Чачэрскага райкома партыі, пасля чаго накіравалі на працу ў Цэнтральны Камітэт КПБ.

І вось у сакавіку восемдзесят трэцяга Котаў зноў вяртаецца на Палессе. Туды, адкуль родам. Да людзей, сярод якіх вырас, чые клопаты вельмі блізкія і зразумелыя.

Лоеўшчына сустрэла яго вострым пахам вясны, яркім сонцам. На двары стаяў сакавік. Гарадок пачаў нетаропка ачышчацца ад зляжалага снегу. На прапталінах, што з'явіліся паблізу Дома культуры, дружна палезлі наверх зялёныя іголкі маладой травы. «А ці не зрабіць тут парк?» — неяк прамільгнула думка ў новага гараджаніна. — Над самым Дняпром — гэта ж здорава!» — дзівіўся ён простаму адкрыццю.

Насустрач ішлі людзі. Папрасіў спыніцца аднаго, другога. Сабралася кучка.

— Такая справа вось, — звярнуўся да ўсіх Котаў. — Хачу з вамі параіцца...

«Хачу з вамі параіцца». Словы гэтыя сталі формулай яго дзеянняў, галоўнай рысай стылю работы партыйнага кіраўніка ў адносінах і да камуністаў, і да беспартыйных.

Працоўны дзень першага сакратара пачынаецца строга а палове восьмай. Час гэты вызначаны не распарадкам дня для партыйных работнікаў, а ім самім. А заканчваецца...

(Заканчэнне на 4—5 стар.).

СЛАВА ХЛЕБУ НАШАМУ

Нядаўна, напярэдадні прафесіянальнага свята работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці аграпрамысловага комплексу, быў урачыста адкрыты музей хлеба. Знаходзіцца ён на тэрыторыі вядомай у рэспубліцы гаспадаркі — калгаса «Савецкая Беларусь» Камянецкага раёна.

Старшыня гэтай гаспадаркі Герой Сацыялістычнай Працы Уладзімір Бядуля прапанаваў размясціць музей на ўзвышшы, каб кожны, хто пройдзе ці праедзе побач, памятаў: хлеб — усяму галава. Так і зрабілі.


На стэндах музея, размешчаных у пяці невялікіх залах, прадстаўлены і экспанаты-рэліквіі, і рэчы будзённыя, добра нам знаёмыя. Сабраныя разам, яны дазваляюць убачыць не толькі цэласную карціну гісторыі калгаса, але і вялікі перыяд гісторыі нашага народа, гісторыі чалавецтва, якое свята шануе хлеб.

Вось пад шкляным каўпаком — зярняты пшаніцы і ячменю, якія праляжалі чатыры з палавінай тысячагоддзі на тэрыторыі старажытнай краіны Урарту. Сабраны каласы дзікіх злакаў, пачынальнікаў збожжавых культур. А побач — плеценая, кажучы па тутэйшаму, стужка для захоўвання зерня, цэп, барана і частка жорнаў — спрадвечныя прылады працы беларускага селяніна.

Прадстаўлены тут і дакументы аб барацьбе за хлеб у першыя гады Савецкай улады, у гады калектывізацыі, Вялікай Айчыннай вайны. Глыбока ўражваюць наведвальнікаў карткі на хлеб ваеннай пары, фотакопіі пісем з блакаднага Ленінграда, здымкі аб ратных справах беларускіх партызан, шматлікія дакументы аб сацыялістычных пераўтварэннях нашых вёсак у пасляваенныя гады. Стэнды музея расказваюць таксама аб тым, як сёння працуюць на каравай не толькі самі земляробы, але і селекцыянеры, рабочыя, якія выпрацоўваюць для вёскі першакласную тэхніку. Свята адкрылася парадам калгаснай тэхнікі. Затым на цэнтральнай плошчы адбыўся ўрачысты мітынг, на якім выступіў У. Бядуля. Лепшыя людзі гаспадаркі ўручылі ганаровым гасцям караваі, выпечаныя са збожжа ўраджаю-86.







НА ЗДЫМКАХ: у гэтым будынку размясціўся калгасны музей хлеба; вось такі каравай спякла да свята загадчыца жывёлагадоўчай фермы Антаніна ПЛІСУН; у адной з залаў музея.

Фота Э. КАБЯКА.





РАЗМОВА ПА ШЧЫРАСЦІ

МІРАМ ПРЫГАЖЭЕ ЧАЛАВЕК

Гэтае свята самае раднасае і самае жаданае. «З Новым годам! — гаворым мы сваім блізкім, знаёмым, дарагім людзям. — З новым шчасцем!» — і жадаем светлых дзён, добрых спраў і здароўя...

Як хутка будуць ляцець хвіліны, пакуль у Маскве на Спаскай вежы гадзіннік не адаб'е дванаццаць удараў... «З Новым годам, усе добрыя людзі, хай сцены вашых хат не пакідаюць любоў і надзеі на заўтрашні дзень — спакойны і мірны ва ўсім свеце!»

Маю гарэзлівую смяшлівую знаёмую завуць Алесяй. Алесі тры гады. Яна любіць сваю паслухмяную ляльку Кацю і яшчэ вельмі любіць спяваць... Я часта чую яе чысты і звонкі галасок у пад'ездзе, чую песню пра белыя караблікі, якія плывуць па небу... Алеся яшчэ нічога не ведае пра свет, ёй не робіцца страшна, калі раптам на тэлеэкране зямля ўздрыганецца ад разрыву бомбы, калі голас дыктара данясе трывожную навіну: недзе зноў адбыліся выпрабаванні атамнай зброі... Для маёй маленькай знаёмай начное зорнае неба яшчэ ўяўляецца светам казкі і здаецца зусім незразумелым такое паняцце, як «зорная вайна»... Але пройдзе тры-чатыры гады — і аднойчы тата падвядзе сваю малую Алесю да шафы, у якой заўсёды хавае невялікую скрыначку... «Што ў ёй?» — запытаецца Алеся, і тата пачне ёй расказваць пра свой завод, пра сяброў, якія працуюць з ім у адным цэху, і пакажа Алесі ордэн Знак Пашаны, якім нядаўна яго ўзнагародзілі, а потым пачне расказваць ёй пра дзеда... І Алеся пачуе пра тое, як дзед яе адным з першых у складзе сваёй партызанскай брыгады ўступіў у разбураны, спапялёны Мінск у далёкім 1944 годзе, а потым пачуе Алеся і пра свайго прадзеда, які загінуў далёка ад Беларусі, недзе ў Заволжскіх стэпах, загінуў за ўладу Саветаў і пакажа зжоўклы ад часу фотаздымак... І доўга будзе Алеся ўглядацца ў твар маладога хлопца ў будзёнаўцы і прачытае на адваротным баку фотаздымка: 1919 год... Можна сказаць, гісторыю сваёй сям'і пачуе Алеся, а можна сказаць — гісторыю народа, гісторыю нашай Бацькаўшчыны... Бо хіба толькі адна сям'я на Беларусі мае такую гісторыю?! У кожнага чалавека ёсць свой асабісты лёс, але яднае людзей лёс краіны, лёс дзяржавы сваёй.

Як часта гавораць людзі: «Гады што птушкі... Праняслiся, праляцелі, бы й не было іх...» І гэта заўжды гаворыцца толькі тады, калі маецца на ўвазе чалавек, яго чалавечы век на зямлі. Пра цэлы ж народ, пра краіну гэтак не скажаш, бо кожны год — гэта своеасаблівая вяха ў нашым жыцці, кожны год застаецца ў памяці нечым вельмі значным і важкім. З незабыўных гадоў складаецца наша жыццё, якое пр[illegible]кэе, робіцца больш заможным з кожным днём. Ісціна заўсёды ў параўнанні... І хоць бы ўзяць маё невялічкае палескае сяло, дзе заўсёды бывае [illegible]най сустрэча з тымі ве[illegible]мі, з тою грэбелькай, з тымі вішнякамі і хатамі, якія кожным акенцам з маленства глядзяцца ў душу... Хаты ўсе пасляваенныя, у час Вялікай Айчыннай вайны вёска згарэла да апошняга бервяна, засталося толькі люстра, якое і да гэтага часу вісіць на сцяне ў матчынай хаце. Гэтае люстра яшчэ да 1939 года купіў дзед Ладзімэр на кірмашы ў мястэчку, купіў для жонкі, цешчы, дачкі... І вось 1942 год... Фашысты падпалілі дзедаву хату, і тая ж самая старэнькая мая прабабуля Дуня выхапіла гэтае люстра з агню, як самую каштоўную рэч у хаце... З гэтым люстрам у руках стоячы на папялішчы, дзе яшчэ дагаралі апошнія галавешкі, сустракала яна сваіх родных, блізкіх, усіх вяскоўцаў, якія паспелі схавацца ад смерці ў лесе. Люстра бачыла тыя горкія слёзы, люстра ўбірала іх у свой бляск, каб запомніць назаўсёды... А потым, пасля вайны, былі слёзы радасці, таму што гэтае, адно-адзінае на ўсю вёску люстра бачыла і першыя вяселлі, і першыя радзіны, у яго глядзеліся прыгажуні пад вэлюмам, у яго глядзеліся юныя жанчыны, перажываючы радасць мацярынства... Гэтае люстра — жывая гісторыя, як і пасляваенныя дрэвы, якімі абсаджваліся першыя хаты... Але ёсць і старыя: каштаны, таполі, ліпы... Яны памятаюць яшчэ больш...

Можа, адно з іх тужліва шумела ўслед фурманцы, на якой пакідала родную вёску, сваю мілую Брэстчыну ў 1929 годзе сястра майго дзеда разам з сынам Аляксандрам. Пошук лепшай долі прывёў іх тады ў Злучаныя Штаты Амерыкі. І вось снежань 1986 года... Разам з прадстаўніком Беларускага таварыства «Радзіма» я сустракаю дзядзьку Сашу... Аляксандра Касевіча ў нашым родным Мінску. Ён не толькі мой госць, ён — госць Таварыства, па чыім запрашэнні яшчэ раз прыехаў у нашу краіну, у заўсёды дарагую яму Беларусь. Спачатку Мінск, потым родная вёска. І ўсюды ўспаміны, і ўсюды шчаслівая радасць ад сустрэч з блізкімі або проста з колішнімі знаёмымі... Гаваркога, з сардэчнай цёплай усмешкай, вельмі абаяльнага дзядзьку Сашу мне цяжка ўявіць на вуліцах Чыкага, але Новы год ён будзе сустракаць там — сярод сваёй сям'і і, мажліва, будзе расказваць сваёй пяцігадовай унучцы Сашы пра сваю далёкую Радзіму, якую, акрамя жонкі Алджы, не бачылі ні яго дочкі — Джойс і Таня, ні яго сыны — Грэгар і Марко, але ведаюць пра яе, і, магчыма, некаму з іх прымроіцца ў навагоднюю ноч пах беларускай смалістай хваістай галінкі.

На пачатку гэтых нататкаў я прыгадала сваю гарэзлівую знаёмую дзяўчынку Алесю і некалькімі сказамі вышэй успамінала пяцігадовую Сашу, якая жыве ў Чыкага, і хочацца яшчэ ўспомніць сваю трохгадовую дачушку Алёнку... Што аб'ядноўвае іх, гэтых мілых, слаўных дзяўчынак? Бялявыя льняныя валасы, ясныя вачаняты, якія заўсёды чакаюць радасці і пяшчоты ад жыцця, якія вераць не толькі маміным словам, а і даверліва глядзяць у кожны чалавечы твар... Хай жа не падмане іх жыццё, хай планета будзе для іх заўсёды ўтульным домам.

Напярэдадні свята Новага года мне хацелася б пажадаць усім людзям добрай волі, усяму прагрэсіўнаму працоўнаму чалавецтву, а таксама землякам сваім, якія жывуць далёка ад Радзімы, ад нашай лясной, азёрнай Беларусі, толькі добрых дзён, толькі мірнага неба, толькі святла ў вокны, бо мірам і шчасцем прыгажэе чалавек, а значыцца і наша Зямля — блакітная зорка Сусвету. З Новым годам, з новым шчасцем, вас!..

Раіса БАРАВІКОВА,
пісьменніца.

МІЛЬЁНЫ АМАТАРАЎ СПОРТУ

Тры мільёны рублёў — такую эканомію за кошт скарачэння колькасці бальнічных лістоў, затрат на амбулаторнае лячэнне, павышэння прадукцыйнасці працы прынеслі дзяржаве за апошнія 10 год тысяча чалавек, якія займаюцца толькі ў адной з так званых «школ загартоўвання» ў Мінску. Гэтую лічбу прывёў у інтэрв'ю газеце «Известия» старшыня Дзяржкамспорту Беларускай ССР **Валянцін САЗАНОВІЧ.**

У нашай рэспубліцы, сказаў ён, спортам займаюцца самыя шырокія масы насельніцтва. Зараз у Беларусі створана каля 1,5 тысячы фізкультурна-аздараўленчых камбінатаў (ФАК), у якіх кожны, хто жадае, можа па месцу свайго жыхарства атрымаць за невялікую плату самыя разнастайныя паслугі — дапамогу трэнера, метадыста, спортпляцоўку і інвентар, сауну пасля заняткаў. У рэспубліцы існуе таксама 300 клубаў для аматараў аздараўленчага бегу, за апошнія пяць год пабудаваны 34 стадыёны, 27 плавальных басейнаў, 446 спортзалаў. За гэты ж час колькасць фізкультурнікаў у Беларусі ўзрасла на 300 тысяч чалавек і на мільён — колькасць тых, хто займаецца вытворчай гімнастыкай (фізкультпаўзы ў рэжыме працы і вучобы). Усяго ж у той ці іншай форме фізічнай культурай і спортам рэгулярна займаюцца каля 3,5 мільёна чалавек — 34 працэнты насельніцтва Беларусі.

— Але мы лічым, што і гэтага недастаткова,— гаворыць Сазановіч. — Напомню банальнук[illegible]іну: фізкультура — гэта [illegible] за ўсё здароўе. А добрае здароўе — не проста лёгкая паходка, ружовыя шчокі і прыўзняты настрой. Гэта яшчэ і высокая прадукцыйнасць працы, яе эфектыўнасць. І мінім[illegible] затрачаных сродкаў на [illegible]гу бальнічных лістоў, на а[illegible]занне медыцынскай дапамогі. Фізкультуру смела можна ўнесці ў эканамічную катэгорыю, гэта, дарэчы, у нас на многіх прадпрыемствах добра разумеюць, і мы стараемся ўсяляк распаўсюджваць іх вопыт.

У якасці прыкладу старшыня Дзяржкамспорту рэспублікі прыводзіць толькі адзін, здавалася б, зусім дробны факт з практыкі вытворчага аб'яднання «Мінскі маторны завод». Тут для рабочых ліцейнага цэха стала звыклай і натуральнай вытворчая гімнастыка, для якой змаглі выдзеліць і абсталяваць рознымі трэнажорамі спецыяльны пакой. Комплекс фізічных практыкаванняў складзены з улікам характару стамлення, уласцівага той ці іншай спецыяльнасці, што дапамагло павысіць прадукцыйнасць працы ліцейшчыкаў на 17,6 працэнта за год. У грашовым выражэнні эфектыўнасць ад укаранення вытворчай гімнастыкі толькі ў дзвюх брыгадах ліцейнага цэха склала 16 200 рублёў. А гэта ж, зразумела, далёка не адзіны цэх у аб'яднанні.

Як расказвае Сазановіч, у рэспубліцы сістэма фізічнага выхавання ўключае ў сябе першым і вельмі важным звяном спорт з самага ранняга дзяцінства. У Мінску ва ўсіх дзіцячых паліклініках да 1990 года ўводзяцца абавязковыя комплексы загартоўваючых мерапрыемстваў для дзяцей ва ўзросце да аднаго года. Пакуль не ва ўсіх, але ўжо ў многіх яслях (дзіцячыя ўстановы, куды прымаюць двухгадовых) малышы адразу ж пачынаюць займацца фізкультурай.

Сазановіч, праўда, прызнае, што праблем у масавай фізічнай культуры ў рэспубліцы пакуль нямала, называючы ў іх ліку, у прыватнасці, яўны недахоп у продажы якаснага інвентару — ад спартыўнага абутку да тэнісных мячоў. Гэтыя пытанні вырашаюцца, а колькасць спартыўных устаноў рознага тыпу ў Беларусі працягвае расці. Акрамя ФАКаў гэта, напрыклад, культурна-спартыўныя комплексы (КСК), клубы па інтарэсах для дзяцей, фізкультурна-аздараўленчыя групы пры спорткомплексах і маладзёжных інтэрнатах, цэнтры здароўя для тых, каму за трыццаць, секцыі аматараў зімняга плавання — пералік можна працягваць і працягваць.

ІСЦІ ДА ЛЮДЗЕЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).

Звычайна тады, калі гарадок мірна ўкладваецца спаць. І заканчваецца не ў цішы райкомаўскага кабінета, а часцей за ўсё ў адной з васьмідзесяці вёсак раёна, на сустрэчы з жыхарамі якіх штодзённа выязджае Уладзімір Уладзіміравіч...

У КАЛГАС «Дружба» мы выехалі пасля абеду. За руль службовага «газіка» сеў сам Котаў. Па тым, як сакратар глыбока зацягваўся цыгарэтай, мне чамусьці падумалася, што ён нечым незадаволены, нервуецца. І, здаецца, адгадаў.

— Ёсць у нас распарадак дня, выпрацаваны і адобраны райкомам партыі, для загадчыкаў яго аддзелаў, сакратароў, адказных работнікаў райвыканкома, кіраўнікоў раённага аграпрамысловага аб'яднання, згодна з якім усе кабінетныя справы павінны завяршацца імі да адзінаццаці. Пасля адзінаццаці — жывая работа з людзьмі на прамысловых прадпрыемствах, у гаспадарках на вёсцы. А я, як бачыце, парушыў сёння гэты распарадак, «пераседзеў» за сталом,— гаварыла ў Котаве сумленне. — Хаця, здаецца, і ўважлівыя абставіны былі...

Ох, і кароткі ж у такую пару светлавы дзень! Здаецца, толькі нядаўна світала, а тут ужо зноў згушчаюцца прыцемкі. Над палямі, з якіх адны засеяны азімінай, другія пустуюць, рыхтуючыся голымі, роўненька ўзаранымі, легчы пад снег без аніякага ў наступным годзе абавязку перад хлебаробамі. Зялёныя прамавугольнікі змяняюцца шэрымі. Шэры колер ад надвор'я? Уладзімір Уладзіміравіч нібы падслухаў мае думкі.

— Дрэнная наша зямля. Па ўрадлівасці адна з самых горшых у вобласці. Шэсцьдзесят працэнтаў сельскагаспадарчых угоддзяў — пяскі. Без земляробчай навукі і думаць няма чаго пра добрыя ўраджаі...

Такая навука ў нашай рэспубліцы, вядома ж, існуе. І, трэба сказаць, высокага ўзроўню. Не ў гэтым была галоўная прычына клопату Котава, калі ён заняў тут пасаду першага. Навуку ўкараняюць у практыку спецыялісты, выпускнікі сярэдніх і вышэйшых сельскагаспадарчых навучальных устаноў. А іх як па земляробству, так і па жывёлагадоўлі, галоўных напрамках спецыялізацыі раёна, было малавата. Тыя ж,

ЗАХОПЛЕНЫ МУЖНАСЦЮ, ГЕРАІЗМАМ І ПРАЦАВІТАСЦЮ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

ШЧАСЦЯ ВАМ І ДАБРАБЫТУ

МНОГІЯ тысячы кіламетраў раздзяляюць Мінск і цэнтр прэфектуры Канагава ў Японіі — горад Іякагама. Але, калі ў доме Хэйхаціра Асакі збяруцца на навагодняе свята родныя і сябры, абавязкова будзе весціся размова пра Беларусь, адкуль зусім нядаўна вярнуўся гаспадар. Больш як тыдзень правёў у нашай рэспубліцы госць з Японіі, пабываў у Мінску, Віцебску, Полацку, наведаў шэраг прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў, навуковых і праектных арганізацый. Такая насычанасць праграмы не выпадковая. Хэйхаціра Асакі — доктар эканомікі, прафесар эканамічнага факультэта універсітэта Канка Гакуін у горадзе Іякагама, ганаровы прафесар Іякагамскага універсітэта, адзін з вядучых японскіх спецыялістаў па савецкай эканоміцы. Ён напісаў цэлы шэраг кніг і брашур аб эканамічным жыцці Савецкага Саюза і еўрапейскіх сацыялістычных краін. Мэтай гэтай паездкі было вывучэнне ходу перабудовы ў сацыяльнай і эканамічнай галінах, якая адбываецца ў краіне пасля XXVII з'езда КПСС. Хэйхаціра Асакі з'яўляецца таксама і старшынёй аддзялення таварыства дружбы «Японія — СССР» у прэфектуры Канагава. Таму абавязкова хацеў сустрэцца ў Беларускім таварыстве дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі з яго кіраўнікамі і актывістамі. Тут і адбылася наша гутарка.

— Я даволі часта наведваю вашу краіну, — сказаў ён. — У васьмідзесятыя гады — практычна кожны год. Пабываў на Далёкім Усходзе, у Сібіры, у рэспубліках Сярэдняй Азіі, на Украіне і ў Малдавіі, у Прыбалтыцы. А вось у вашу рэспубліку трапіў упершыню, хаця даўно збіраўся прыехаць сюды. Пра Беларусь я ўпершыню даведаўся ў гады другой сусветнай вайны. Тады я быў яшчэ зусім маладым чалавекам, вучыўся ва універсітэце ў Токіо. Японія яшчэ не ваявала, і мы ўважліва сачылі за падзеямі ў Еўропе. Вось тады я не раз чуў пра Беларусь. Значна пазней я даведаўся, якія вялікія ахвяры панёс савецкі народ у той вайне — 20 мільёнаў загінуўшых, а ў вашай рэспубліцы загінуў кожны чацвёрты жыхар. Таму тое, што я ўбачыў цяпер, зрабіла на мяне моцнае ўражанне.

— Ваша краіна таксама панесла немалыя страты ў час вайны...

— Гэта так. Але, на жаль, наша краіна ўдзельнічала ў вайне на другім баку, — адзначыў Хэйхаціра Асакі, — людзі гінулі дзеля гегеманісцкіх імкненняў ваеннай клікі. Але менавіта гэтыя бессэнсоўныя ахвяры прымусілі многіх японцаў усвядоміць сутнасць падзей, зразумець, што вайна ні ў якім разе не можа быць спосабам вырашэння рознагалоссяў паміж дзяржавамі. Зразумеў гэта і я, хоць у той час гэта было не так проста. Прапагандысцкая машына працавала інтэнсіўна і толькі ў адным напрамку. Усе кнігі, у якіх выказваліся іншыя погляды, былі знішчаны. Але за вайну загінула адна трэць маіх аднакласнікаў. Дзеля чаго? Дзеля чаго былі скінуты атамныя бомбы на Хірасіму і Нагасакі, якія забралі дзесяткі тысяч жыццяў? Як эканамісту, мн[illegible]лі ясныя адказы на [illegible]ля пытанні. Агрэсіўнасць, імкненне да захопу новых рынкаў, да войнаў закладзены ў самой сутнасці капіталізму. А ці магчыма іншая палітыка, іншыя ўзаемаадн[illegible]ы паміж краінамі? Вось т[illegible] я зацікавіўся эканомікай сацыялізму, стаў уважліва сачыць за жыццём вашай краіны. Я пазнаёміўся з творамі класікаў марксізму-ленінізму. Дарэчы сказаць, я ганаруся тым, што пераклаў на японскую мову некаторыя работы Энгельса і Леніна, а таксама кнігу амерыканскага журналіста Джона Рыда «Дзесяць дзён, якія скаланулі свет». Цікавасць да вашай краіны, антываенныя перакананні і прывялі мяне да актыўнага ўдзелу ў рабоце таварыства «Японія — СССР».

— Якія задачы ставіць перад сабой ваша Таварыства?

— Перш за ўсё ўмацоўваць дружбу і ўзаемаразуменне паміж нашымі народамі, — адказаў Хэйхаціра Асакі. — Наша краіна вельмі цесна звязана з ЗША ў эканоміцы і палітыцы. Не сакрэт, што з сямідзесятых гадоў Злучаныя Штаты стымулююць мілітарызацыю Японіі, падаграваюць антысавецкія настроі ў краіне. Прэса кіруючых колаў таксама знаходзіцца пад вялікім уплывам ЗША, і з яе публікацый у насельніцтва складваецца скажонае ўяўленне аб Савецкім Саюзе. А мы робім вельмі многае для таго, каб людзі даведваліся праўду аб вашай краіне, аб яе палітыцы. У вас ёсць добрая прымаўка — «лепш раз убачыць, чым сто разоў пачуць». І я ў сваёй рабоце ў Таварыстве асноўную ўвагу ўдзяляю арганізацыі паездак груп японскіх спецыялістаў у вашу краіну. У 1982 і 1984 гадах я прывозіў сюды групы эканамістаў. Абмен такімі групамі вельмі важны для развіцця ўзаемаразумення, паколькі нават прагрэсіўна настроеныя японцы не заўсёды валодаюць аб'ектыўнай інфармацыяй аб Савецкім Саюзе.

— Ці вядома ў Японіі аб тых кроках, якія робіць наша краіна для ўмацавання міру, аб шматлікіх мірных ініцыятывах, зробленых сёлета?

— Так, вядома. Наша прэса не можа замоўчваць такія важныя падзеі, як Заявы Генеральнага сакратара ЦК КПСС, сустрэча кіраўнікоў СССР і ЗША, аднабаковы мараторый на ядзерныя выбухі. Аднак у рэдакцыйных каментарыях іх прадстаўляюць як прапагандысцкія акцыі, якія Савецкі Саюз не мае намеру рэальна выконваць. Зноў жа пад уплывам



ЗША многа гаворыцца аб тым, што неабходна ўцягнуць Савецкі Саюз у гонку ўзбраенняў, каб выматаць яго эканамічна. Многія эканамісты лічаць, што гэта рэальна, хоць гісторыя даказала, што ўсе падобныя спробы асуджаны на правал. Дарэчы, аб адносінах да гісторыі. Мяне, як і многіх іншых японцаў, хто разважае разумна, хвалюе т[illegible] што ад нашай моладзі імк[illegible]а ўтаіць многія гістарычныя факты, якія, на думку кіруючых вярхоў, ім не варта ведаць. Міністэрства асветы наўмысна няправільна выкл[illegible]ае гісторыю ў школьных [illegible]учніках. Дайшло да таго, [illegible]то многія маладыя людзі не ведаюць, хто скінуў бомбы на Хірасіму і Нагасакі. Гэта страшна. Без ведання і правільнага разумення гісторыі немагчыма будаваць будучыню.

— Дзве трагічныя падзеі адбыліся ў адыходзячым годзе — гібель касмічнага карабля «Чэленджэр» і аварыя на Чарнобыльскай АЭС. Што вы адчулі, даведаўшыся аб іх?

— Пачуццё вялікай трывогі, трывогі за лёс чалавецтва, — не задумваючыся, сказаў Хэйхаціра Асакі. — Адкрыццё ядзернай энергіі і стварэнне ядзернай энергетыкі патрэбны былі для таго, каб зрабіць жыццё чалавека багацей і шчаслівей. Але гэтыя падзеі напомнілі нам, што нават мірны атам, які выйдзе з-пад кантролю, можа прынесці вялікую шкоду чалавеку. Таму трэба ў многа разоў узмацніць кантроль за выкарыстаннем ядзернай энергіі. Вялікая адказнасць ляжыць сёння на кіраўніках краін, якія маюць ядзерную зброю. Ні ў якім разе нельга дапусціць, каб яна была выкарыстана. Гэта будзе азначаць канец чалавецтва. У вашай краіне гэта добра разумеюць. Разумее гэта і ўсё больш людзей у розных краінах. Таму такі вялікі размах прыняў сёння рух за захаванне міру. Аб жыццёвай важнасці праблемы сведчыць і тое, што 1986 год быў аб'яўлены Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый Міжнародным годам міру.

— І апошняе пытанне. Праз некалькі дзён нас чакае вясёлае навагодняе свята. Што б вы хацелі пажадаць беларусам, усім людзям у новым годзе?

— Перш за ўсё шчасця, любві і міру, — усміхаецца Хэйхаціра Асакі. — Жадаю вам яшчэ лепш працаваць для захавання міру, каб ніколі больш на тэрыторыі Беларусі не было вайны, каб яе ўвогуле нідзе і ніколі не было. 1987 год, па старадаўняму ўсходняму календару, будзе годам зайца. Лічыцца: каб ён быў шчаслівым, у доме трэба зрабіць стараннаю чыстку і выкінуць усё непатрэбнае. Я б прапанаваў усім нам таксама прыбраць у нашым агульным доме, на Зямлі, і назаўсёды выкінуць на звалку непатрэбнае смецце — ядзерную і ўсякую іншую зброю.

Рыгор ФАМЕНКА.

хто прыязджаў сюды па размеркаванню, доўга не затрымліваліся: Лоеўшчына — глыбінка. Вырашэнне праблемы бачылася першаму сакратару толькі ў падрыхтоўцы ўласных кадраў. Ідэю падтрымалі і члены бюро райкома.

А канкрэтнае ажыццяўленне яе было такім. Штогод для 25—30 юнакоў і дзяўчат, выпускнікоў сярэдніх школ раёна, якія жадаюць звязаць сваё жыццё з сельскай гаспадаркай, вырашылі праводзіць дадатковую падрыхтоўку для паступлення ў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію ў лепшых выкладчыкаў Лоеўскага педагагічнага вучылішча. Такая арганізацыя справы дала свой плён: цяпер праз уступныя экзамены і конкурсны адбор у ВНУ праходзяць амаль усе. А гэта значыць, што ў недалёкай перспектыве праблема сельскагаспадарчых спецыялістаў тут будзе знята: ужо зараз у акадэміі вучыцца каля шасцідзесяці пасланцоў з Лоеўшчыны.

Я не выпадкова завёў размову пра кадры. Гэта аснова асноў партыйнай работы. І ў цэнтры — работа з кадрамі кіруючымі, ад якіх у многім залежаць лёсы вялікай колькасці іншых людзей, цэлых працоўных калектываў. Дзейнасць савецкага партыйнага работніка любога рангу, у тым ліку і першага сакратара раённага камітэта партыі, у канчатковым выніку і зводзіцца да аднаго: клопату пра людзей. Пра ўсіх разам і пра кожнага асобнага чалавека. А падбор кіруючых кадраў — справа няпростая...

У «Дружбе», куды мы кіраваліся, старшынствуе Васіль Кугуенка. Чатыры гады назад, калі адкрылася тут вакансія кіраўніка гаспадаркі, мясцовым калгаснікам райком партыі прапанаваў яго кандыдатуру, як добра зарэкамендаваўшага сябе на ранейшай пасадзе — дырэктара раённай племяной станцыі. Калгаснікі згадзіліся, выбралі старшынёю. Аднак хуткага цеснага кантакту ў новага кіраўніка з працоўным калектывам не атрымалася. Райком, які рэкамендаваў Кугуенку, зразумела, адчуваў сябе ніякавата перад калгаснікамі. Памылка? Але ж Васіль Аляксеевіч, бяспрэчна, валодаў добрымі арганізатарскімі здольнасцямі, практычным вопытам. Выйсце, расказваў Уладзімір Уладзіміравіч, знайшлося даволі нечаканае. На чале партыйнай арганізацыі «Дружбы» стаў таксама новы чалавек, аднаго прозвішча з першым сакратаром, Ларыса Котава. Усё яе жыццё звязана з вёскаю, і таму яна добра ведае псіхалогію сельскага жыхара.

Котава, абаяльная і мудрая жанчына, «злучыла» патэнцыяльна здольнага кіраўніка і калектыў, тонка змагла наладзіць іх адносіны. Зараз мікраклімат у «Дружбе» значна аздаравіўся, справы гаспадаркі рэзка палепшыліся...

Ларыса Іванаўна першай і сустрэлася нам на жывёлагадоўчай ферме. Зазірнулі мы ў пакой адпачынку, з густам абстаўлены, як у самай сапраўднай жылой кватэры. Добрая мэбля, тэлевізар, колерамузыка. На сцяне — вялізных памераў карціна, на якой талентавітай рукою мастака намаляваны цудоўны куток мясцовай прыроды. Павітацца з першым сакратаром прыйшлі даяркі, мужчыны-жывёлаводы. Бачна, што часты тут госць Уладзімір Уладзіміравіч — кожнага чалавека ведае па імені. І па іх гутарцы, адкрытай, душэўнай, адчувалася — жаданы. Для кожнага калгасніка ў яго знаходзілася цёплае слова... Прызнаюся шчыра, дзесьці ўпотай я адчуваў радасць і гордасць за свайго героя — Котава-чалавека, Котава-партыйца...

На жывёлагадоўчых фермах «Дружбы» я пабачыў не толькі колерамузычную апаратуру. А і фізіятэрапеўтычныя кабінеты, пра якія гаварыла жанчына з Марса. І не толькі ў «Дружбе». І не толькі гэта. У саўгасе «Лоеўскі», напрыклад, увішны дырэктар Валянцін Тальчук сярод іншых сваіх нядаўніх новабудоўляў паказаў механічныя майстэрні, дзе пад адным дахам з імі завяршалася аддзелка сталовай, лазні, цырульні для механізатараў. І ківаў у бок Котава: маўляў, яго ініцыятыва.

Трэба сказаць, Лоеўшчыне і да Уладзіміра Котава шанцавала на першых сакратароў. Папярэднія, Рыгор Патачыц, Сяргей Бабыр ды і іншыя, шмат зрабілі, каб лепш жылося тутэйшым людзям. Сярод жыхароў Лоева самі не вылучаліся ні лепшым у горадзе жыллём, ні якімі-небудзь іншымі прывілеямі. Калі была чарга да ўрача ў паліклініку або за білетамі на добры кінафільм ці на канцэрт прыезджых артыстаў — абавязкова станавіліся ў яе канец. Цяперашні, Уладзімір Уладзіміравіч, не выключэнне. І гэтым таксама ствараецца аўтарытэт у народзе як саміх партыйных лідэраў, так і партыі ў цэлым.

КОТАЎ стаіць на чале раёна ў складаны час. Час перабудовы, якая павінна прывесці Савецкую краіну да вялікіх эканамічных і сацыяльных змен. Гэты адказны момант патрабуе максімуму ўвагі да чалавека, галоўнага фактара нашай перабудовы.

Што казаць, Котаў, як лідэр паўтаратысячнай раённай арганізацыі камуністаў, мае добрую рэпутацыю ў Гомельскім абласным камітэце партыі. І ўсё ж, калі ў пачатку сёлетняга лета статыстычная зводка па нарыхтоўцы зялёных кармоў для жывёлы зафіксавала Лоеўскі раён як адстаючы, сакратара тэрмінова выклікалі на бюро. Разабрацца, у чым справа.

Не, Уладзімір Уладзіміравіч не адчуваў сябе вінаватым. Такога графіка дзеянняў патрабавала геаграфічная спецыфіка раёна — месцазнаходжанне галоўнай кармавой базы ў міжрэччы Дняпра і Сожа. Спешка з уборкаю лугавых траў магла б адмоўна адбіцца на канчатковых выніках — такім быў вывад Котава-агранома. Таму і павёў ён так сваю лінію... Члены бюро абкома на сваім пасяджэнні мусілі прызнаць ініцыятыву першага сакратара райкома партыі аб'ектыўнай і правільнай...

У кожнага бываюць у жыцці складаныя, а то і цяжкія хвіліны. У Котава — таксама. Розныя людзі па-рознаму перадольваюць іх, вяртаюць душэўную раўнавагу. Котаў — працай. Працай да сёмага поту. І толькі, калі, здаецца, зусім не застаецца для новых спраў фізічных сіл, дае волю пачуццям. Адпраўляецца... на спатканне з Дняпром. Няма для Уладзіміра Уладзіміравіча больш дзейснага лячэбнага сродку, чым вільготны рачны свяжак і выгляд непаўторных дняпроўскіх краявідаў!..


З высокага стромкага берага рачная плынь, якая ўпарта адольвае пясчаныя перашкоды, нагадвае плынь часу. Там, за далёкім паваротам, яго дзяцінства, юнацтва. Успаміны, успаміны... Ён жа некалі хацеў стаць суднабудаўніком. І калі скончыў дзесяцігодку, паклаў у канверт дакументы і пайшоў на пошту, каб адправіць у караблебудаўнічы інстытут. Па дарозе сустрэў сябра Івана Грыба. «Ты што, Валодзя?! Ад нашага Палесся назаўсёды?.. Ад нашых садоў і рэчак?.. Давай лепш разам у акадэмію і пасля назад сюды...»

Дзякуй Івану. Дзякуй маці, патомнай сялянцы Кацярыне Кірылаўне, якая, выпраўляючы яго ў жыццёвую дарогу, сказала некалі на развітанне: «Ідзі, сын, да людзей...»

З мацярынскім наказам Уладзімір Котаў, першы сакратар Лоеўскага раённага камітэта партыі, крочыць па жыцці і сёння.

Міхась СТЭЛЬМАК.

ЖУРНАЛІСТ КАМЕНЦІРУЕ ПАДЗЕЮ





РЭФЕРЭНДУМ НА ФОНЕ ВЫСТАЎКІ



Час падзеі: лістапад 1986 года. Месца: мінскі Палац мастацтва. Характар падзеі: мастацкая, грамадская, палітычная. Гэта з кароткіх даных пра адну з апошніх рэспубліканскіх мастацкіх выставак.

Чым жа адметная яна ў шэрагу разнастайных выставак, што адбыліся на працягу года?

Давайце зробім спачатку кароткую экскурсію, беглы агляд экспазіцыі, што размясцілася ў трох залах Палаца. Каля 500 твораў розных відаў выяўленчага мастацтва змаглі ўбачыць на ёй гледачы. Гэта далёка не ўсё, што было падрыхтавана беларускімі жывапісцамі, графікамі, скульптарамі, «прыкладнікамі» да галоўнай выстаўкі года «Майстры культуры за мір».

...Тут някідкія пейзажы роднага краю, нацюрморты, партрэты выдатных людзей рэспублікі, гістарычных дзеячаў Беларусі, карціны, прысвечаныя падзеям апошняй вайны, і на сучасную тэматыку. Калейдаскоп жыцця ў розных сваіх праявах. Пераходзіш ад работы да работы, і табою авалодвае пачуццё трывогі, неспакою.

Ля невялікага палатна У. Тоўсціка «Летні вечар» нездарма заўсёды людна.

Сюжэт просты: маладая жанчына з немаўл[illegible]м на руках глядзіць тэлевізар. Ціхі, цёплы, мірны вечар. Расчынены дзверы на балкон. А з экрана тэлевізара глядзіць на маладую маці і на нас чалавек-прывід у процівагазе, «урываюцца» ў пакой і «размяшчаюцца» на падлозе, як на ваенным аэрадроме, самалёты са смяротным грузам... Усяго гэтага не бачыць дзіця. Маці павярнула яго ад тэлевізара, і тое шырока раскрытымі вачанятамі даверліва пазірае на гледача. «Трывога! Трывога! Трывога!— нібы гаворыць мастак. — Над нашым мірным жыццём, над будучыняй нашых дзяцей навісла небяспека!»

Грамадзянскай страснасцю, публіцыстычнасцю пазначаны многія работы на гэтай не зусім звычайнай выстаўцы. Яна стала своеасаблівым мітынгам, рэферэндумам у абарону міру, у якім прынялі ўдзел не толькі мастакі, але і дзеячы іншых відаў мастацтва.

Нагадаю толькі асобныя моманты гэтага рэферэндуму.

Дзень дзяцей. Ён стаў пралогам Тыдня міру.

...З раніцы запоўніла Палац сталічная дзятва. Сёння тут усё для іх. На століках раскладзены папера, алоўкі, пэндзлі. Гэта для ўдзельнікаў конкурсу «Нам патрэбны мір». У «Куточку рамёстваў» працуюць з глінай, дрэвам, саломкай хлопчыкі і дзяўчынкі мінскіх студый і гурткоў выяўленчага мастацтва. Побач у зале для малодшых школьнікаў арганізавана сустрэча з мультыплікатарамі кінастудыі. А потым дзеці паглядзяць мультфільмы, лялечны спектакль, канцэрт. Завершыцца гэты вясёлы карнавал вялікай экскурсіяй дзяцей па выстаўцы.

Дзень дойліда. Сустрэчу з гледачамі на выстаўцы адкрывае старшыня Саюза архітэктараў БССР Я. Кавалеўскі. Пра работу па рэгенерацыі цэнтраў гарадоў, захаванню культурна-гістарычных каштоўнасцей расказалі лаўрэат Ленінскай прэміі і прэміі камсамола Беларусі Л. Левін і галоўны архітэктар вытворчага аб'ядНання «Белрэстаўрацыя» С. Багласаў.

А потым на выстаўцы адбудуцца Дзень тэатра, Дзень музыкі, Дзень паэзіі... На сустрэчу з гледачамі прыйдуць вядомы драматург А. Дудараў, кампазітар Э. Ханок, паэт У. Някляеў, скульптар А. Анікейчык, артысты маладзёжнага тэатра, музыканты, літаратары. Будуць гучаць песні, вершы, музыка.

Узнікаюць цікавыя дыскусіі па самых розных праблемах сучаснага жыцця і па галоўнай з іх — праблеме захавання міру на планеце. Прадстаўнікі розных відаў мастацтва сыдуцца ў тым, што галоўная мэта сучаснага мастацтва — давесці да свядомасці людзей, што яны, жыхары атамнага веку, стаяць зараз перад апошняй, ракавой лініяй, перайшоўшы якую, знікнуць назаўсёды з твару зямлі. І толькі разуменне гэтага кожным ды агульныя намаганні чалавецтва могуць забяспечыць яму будучыню.

С. АНТОНАВА.

НА ЗДЫМКАХ: У. ТОЎСЦІК. «Летні вечар»; А. МЯТЛІЦКІ. «Хлопчык з птушкай»; М. ПЮКЕ. «Пасляваенная вясна»; у зале выстаўкі «Майстры культуры за мір».

Фота У. ШУБЫ.

РЭЖЫСЁР КІНАСТУДЫІ «БЕЛАРУСЬФІЛЬМ» ВЯЧАСЛАЎ НІКІФАРАЎ СЁЛЕТА СТАЎ ЛАЎРЭАТАМ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПРЭМІІ СССР

ШЛЯХ ДА СЯБЕ

Першае глядацкае ўражанне: да чаго ж непадобны адзін да аднаго фільмы Вячаслава Нікіфарава!.. Недасведчанаму чалавеку і зусім можа здацца, што належаць яны розным людзям. І сапраўды, што, здавалася б, можа быць агульнага паміж фільмам «Хлеб пахне порахам», сацыяльнай драмай часоў грамадзянскай вайны, і лірычнай камедыяй «Ціхія троечнікі», прысвечанай будням школы, паміж вострапубліцыстычнай стужкай «Сын старшыні», якая расказвае аб праблемах сучаснай вёскі, і экранізацыяй рамана Івана Тургенева «Бацькі і дзеці», дзе ўзнаўляецца атмасфера мінулага стагоддзя?

Вось з такога пытання і пачалася наша гутарка з рэжысёрам у адну з рэдкіх паўз у яго вельмі напружаным рабочым дні.

— Пачынаць, напэўна, трэба з таго, — гаворыць Вячаслаў Аляксандравіч, — што рэжысёр не можа зачыніцца ў кабінеце і ствараць фільм за фільмам толькі для ўласнага задавальнення. Ён заўсёды звязаны са справамі і клопатамі кінастудыі, залежыць ад якасці прапанoўваемай драматургіі, тэматычнага планавання. І ў гэтым сэнсе я, спадзяюся, сумленна дзяліў і дзялю з «Беларусьфільмам» яго пошукі, надзеі, на[illegible]кі...

[illegible]рамя таго, адзінства аўтарскага светаадчування — зусім не сінонім аднастайнасці. Калі пісьменніку, рэжысёру ёсць што сказаць аб жыцці, то тады ўжо не важна, [illegible]ра які час ён гаворыць, я[illegible] жанравымі прыёмамі кар[illegible]стаецца. І ў сучасным дэтэктыве, і ў экранізацыі старажытнай трагедыі, і ў сучаснай камедыі можна з аднолькавай мерай шчырасці і глыбіні гаварыць пра чалавечыя пакуты і надзеі. І ў гэтым сэнсе мае стужкі, спадзяюся, унутрана сугучныя, бо мяне заўсёды цікавілі ў кіно людзі дзеяння, моцныя перакананасцю.

І зрэшты, калі пасля слоў Вячаслава Нікіфарава ўспомніць яго творчы шлях, што змясціў дзесяць пастаўленых фільмаў, то стане відавочным імкненне рэжысёра ў кожнай стужцы захоўваць вернасць сабе, сваёй тэме, цікавасць да глыбокіх, яркіх характараў, людзей, якія не згінаюцца пад ударамі лёсу, жывуць па законах дабра, справядлівасці, сумлення.

Найбольш любімы рэжысёрам чалавечы тып быў увасоблены на экране з дапамогай выдатнага акцёра, народнага артыста СССР Уладзіміра Самойлава, які зняўся ў пяці стужках Нікіфарава. Ён умее разгледзець нават у самым, на першы погляд, сціплым чалавеку незвычайную духоўную глыбіню. Такім атрымаўся рэвалюцыйны матрос у фільме «Хлеб пахне порахам». Акцёр паказаў духоўную моц, незгінальнасць аднаго з тых радавых рэвалюцыі, якія на абломках старога свету ўзводзілі новыя чалавечыя і сацыяльныя адносіны, плацячы за гэта крывёю, а то і ўласным жыццём.

Іншы тып рэжысёр і акцёр увасобілі ў фільме «Сын старшыні», які стаў у свой час прыкметнай з'явай у беларускім кіно. Якім павінен быць сучасны кіраўнік на вёсцы? Як спалучаць матэрыяльны дастатак з духоўным напаўненнем жыцця? Куды рухацца заможнаму калгасу? Гэтыя пытанні ўзнімала карціна, сканцэнтроўваючы сваю ўвагу на асобе старшыні калгаса Якаве Русаку — чалавеку, які падняў калгас цяжкай пасляваеннай парой, аддаў любімай справе ўсе свае сілы, вопыт, веды і цяпер, нібы эстафету, перадае старшынства свайму сыну — прадстаўніку новай сельскай інтэлігенцыі.

Аўтары фільма, ідучы следам за славутым раманам Тургенева, разважаюць пра карэнныя пытанні чалавечага быцця: што ёсць Абавязак, Сумленне, Шчасце, у чым сэнс існавання чалавека на зямлі? Уладзімір Самойлаў, які іграе бацьку Яўгенія Базарава, увасобіў усю гаму, усе адценні бязмежнай чалавечай дабрыні, накіраванай на ўсё жывое і існае. Тым самым ён яшчэ выразней адцяніў драму сына Яўгенія — чалавека, які абагнаў свой век і ў сілу гэтага вымушаны быць бескампраміснa жорсткім, па-максімалісцку патрабавальным да сябе, да іншых.

— Сцвярджаючы волю, унутраную сілу Яўгенія Базарава, — расказвае рэжысёр, — мы клапаціліся і аб іншым: нам было важна правесці думку, што, якая б высокая місія ні стаяла перад чалавекам, у яго заўсёды існуе абавязак сэрцам разумець людзей — так, як гэта робіць бацька Яўгенія. Прадчуванне смерці нібы выклікае да жыцця патрэбнасць у шчырасці, у праяўленні простых чалавечых пачуццяў і ў малодшага Базарава.

Гэта карціна стала падзеяй у савецкім кіно, яна пашырыла нашы ўяўленні аб экранізацыі класікі. Група стваральнікаў чатырохсерыйнага тэлевізійнага фільма «Бацькі і дзеці» была ўдастоена Дзяржаўнай прэміі СССР. У гэтай стужцы сышліся многія асаблівасці рэжысёрскага почырку Вячаслава Нікіфарава: яго лірызм, сацыяльная страснасць, паглыбленая ўвага да душы чалавека, да руху яго сэрца. Фільм, будучы дзевятай карцінай у творчасці рэжысёра, без сумнення, стаў новым пунктам адліку ў яго далейшым творчым лёсе.

— Цяпер усе мае думкі аддадзены экранізацыі «Дуброўскага», — расказвае рэжысёр. — Гэта аповесць вялікага Пушкіна — адзін з самых загадкавых яго твораў. Яго нельга пераказаць, як нельга пераказаць усмешку Джаконды, танец Галіны Уланавай... Скарыстоўваючы ўвесь арсенал сучаснага кінематографа, нам трэба будзе даць кінематаграфічнае прачытанне гэтага шэдэўра літаратуры, наблізіць яго да сучаснага гледача. Ці можа быць задача больш высакароднай і адначасова цяжкай? Але класіка так неабходна ў нашым жыцці!

Акрамя экранізацыі «Дуброўскага», у планах рэжысёра фільм на сучасную тэму, пастаноўка стужкі аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны. Зрэшты, не выключана, што гэтыя задумы будуць на некаторы час адсунуты. Таму што на апошнім з'ездзе кінематаграфістаў Вячаслава Нікіфарава выбралі першым сакратаром рэспубліканскага творчага Саюза. Клопаты аб павышэнні мастацкага ўзроўню беларускіх стужак, падрыхтоўка маладых творчых кадраў, тактыка і стратэгія тэматычнага планавання — усе гэтыя пытанні знаходзяцца ў цэнтры ўвагі сакратарыята і патрабуюць творчых адносін у першую чаргу з боку першага сакратара.

Леанід ПАЎЛЮЧЫК.

ЗНАЁМІМ З ТВОРЧАСЦЮ МАЛАДЫХ

ЯК УЗЫХОДЗЯЦЬ ЗОРКІ



Балерына стаяла, адвярнуўшыся ад залы да акна. У яе фігурцы была стомленасць, расчараванне ў сабе, спустошанасць, і не было толькі аднаго — жадання ўсё гэта ўтаіць ці пераадолець. А мне ўспомніліся радкі з рэцэнзіі: «Інеса Душкевіч — гэта лёгкая бязважкая балерына, чые крокі, рухі, позы нагадваюць хутчэй птушку, чым чалавека. Гэта ўзыходзячая зорка, якой наканавана зззяць...»

Дзесяць год назад прыйшла яна ў тэатр, стала яго вядучай балерынай, прызёрам Усесаюзнага конкурсу артыстаў балета, лаўрэатам прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, любіміцай гледачоў.

Іна заўсёды лічылася ў вучылішчы вучаніцай, якая падае надзеі. Яна танцавала там амаль усё магчымае са старых балетаў. У тэатры на яе адразу звалілася нечаканая адказнасць: дзяўчыне даручылі рыхтаваць галоўную партыю ў «Лебядзіным возеры». Але першыя спектаклі многіх расчаравалі. Перад Інай паўстаў псіхалагічны бар'ер — ёй не даваліся тэхнічныя складанасці і не хапала дыхання для свабоднага танца. У тэатры бытуе няпісанае, але праверанае часам меркаванне: «Калі для танцоўшчыцы ёсць праблемы ў тэхніцы, то прымай яна ніколі не стане». Пра Іну гаварылі: «Вельмі здольная, назат таленавітая дзяўчынка, але...» У яе не хапала характару, сілы волі. Трэба было перамагчы сябе, а самае галоўнае — паверыць у тое, што ты можаш. Гэта цяжка, але Іна якраз з тых натур, якія раскрываюцца не адразу, а раскрыўшыся, уражваюць яркасцю таленту. Гэтаму ў вялікай ступені памагла народная артыстка БССР Н. Давыдзенка, якая ўвесь свой сцэнічны вопыт пастаралася перадаць вучаніцы. Дзякуючы іх карпатлівай сумеснай рабоце Іна набыла сваю ўласную, ні да кога не падобную манеру выканання, сваю творчую індывідуальнасць.

З Нінай Давыдзенка Іна падрыхтавала партыю Кітры, якая парадавала лёгкасцю выканання, Кармэн, потым Сільфіду, Балерыну ў «Пахіце», Жызэль.

Адточвалася тэхніка танцоўшчыцы, удасканальвалася пластыка, і ў адным са спектакляў «Лебядзінага возера» Адэта-Адылія Інесы Душкевіч заззяла. Заспявалі рукі, выразным зрабіўся паварот галавы і корпуса, усё стала важным, значным.

Пасля гэтага спектакля Давыдзенка сказала:

— Цяпер ужо можна гаварыць пра майстэрства, а да майстра і патрабаванні асаблівыя!

І мела рацыю.

Спачатку галоўны балетмайстар тэатра народны артыст СССР В. Елізар'еў даручыў Інесе ролю Распусніцы ў «Карміне Буране» К. Орфа. Выкананне гэтай партыі раскрыла ў танцоўшчыцы здольнасць злучаць гратэск з надзвычайнай жаноцкасцю, ствараючы на рэдкасць прыцягальны вобраз. Пасля гэтай прэм'еры пачалася падрыхтоўка да Усесаюзнага конкурсу артыстаў балета, на які з'язджаюцца найбольш таленавітыя маладыя балерыны і танцоўшчыкі з усёй краіны. Работа перад конкурсам запомнілася Іне страшнай стомленасцю, бязлюддзем рэпетыцыйнай залы, а сам конкурс быў як свята, на якім усё атрымлівалася нібыта само сабой.

Пасля конкурсу Іна адчула сябе ў новай якасці. На яе глядзелі як на прызнанага майстра, лаўрэата, значыць цяпер яна не мела права нават на нязначныя памылкі ў танцы. Медаль лаўрэата не толькі радаваў і надаваў сілы, ён абавязваў да яшчэ большай самаадданасці. Іна была гатова да гэтага, і новыя партыі ішлі адна за адной: Ева ў «Стварэнні свету», Фрыгія ў «Спартаку», Закаханая ў «Карміне Буране», Дзяўчына ў «Балеро».

Яна працуе засяроджана і самапаглыблена, дасканала прадумваючы кожную дэталь не толькі танца, але і касцюма, грыму, прычоскі.

Я пытаюся ў Іны, што б яна рабіла, калі б не стала балерынай.

— Не ведаю... Ап[illegible]лі я нечым захапляюся, то аба[illegible]ова паінна ўсё аддаць гэтай справе. Так і ў балеце.

Справядлівасць яе слоў я яшчэ раз ацаніла, чытаючы рэцэнзіі аб гастролях беларускага балета ў Грэцыі. Там яе Фрыгі[illegible]звалі ўвасабленнем пакорлівасц[illegible]яшчоты, а саму балерыну — тонкім і звышчулым музычным інструментам.

Інесе Душкевіч 28 год, у 23 яна стала вядучай балерынай. Зусім нядаўна ёй і Аляксандру Куркову, партнёру, прысуджана прэмія Ленінскага камсамола Беларусі. Гэта ўзнагарода — прызнанне таленту і стымул для далейшых здзяйсненняў.

Спецыялісты і гледачы гавораць пра незвычайную лёгкасць і выразнасць танца Інесы Душкевіч, стабільнасць майстэрства, багаты ўнутраны свет яе гераінь.

Калі зайшла размова пра планы на будучыню, Іна загаварыла горача:

— Танцаваць як мага больш! І класіку, і новыя балеты, і канцэртныя нумары! А ўвогуле, у мяне вельмі многа інтарэсаў. Бо каб добра танцаваць, нельга замыкацца толькі ў балеце, ні ў якім разе!

На маё пытанне пра любімага пісьменніка Іна, не задумваючыся, адказала: «Вядома ж, Талстой! Ён мне дае вельмі многа, і чым больш я чытаю, тым больш здзіўляюся яго невычэрпнасці».

З мастаком Іне бліжэй тыя людзі, каму давялося многае перажыць. Менавіта таму ў іспанскім горадзе Таледа яна стаяла перад палатном Эль Грэка, як зачараваная, а потым прызналася:

— Мне здавалася, што больш трагічных і выразных за гэтыя твары і рукі, што намаляваны мастаком, нічога на свеце быць не можа!

Ці змянілі што-небудзь у яе характары становішча вядучай балерыны, лаўрэацкія званні і медалі? Не, ніколькі. У ёй тая ж сціпласць і сур'ёзнасць, тое ж уменне быць у цэнтры шумнай кампаніі і замыкацца ў сабе, адыходзячы ад вяселля, тая ж непасрэднасць і зусім дзіцячая шчырасць.

Дык як жа ўсё-такі яна стала зоркай?

— Трэба многа працаваць, вельмі многа. І заўважаць вакол сябе не толькі тое, што не падабаецца, але і ўсё добрае.

Іна задумваецца і амаль адразу ўсміхаецца:

— А яшчэ абавязкова трэба, каб пашанцавала! Вось як мне: і з педагогамі, і з сябрамі, і з усім нашым тэатрам.

Наталля ЗЕМЧАНКАВА.

САДРУЖНАСЦЬ МУЗЫКАНТАЎ

Традыцыйныя творчыя сувязі існуюць паміж інтэлігенцыяй, кампазітарамі і музыказнаўцамі Беларусі і Украіны. Нядаўна ва ўкраінскім горадзе Цярнопалі адбыўся канцэрт, складзены з твораў кампазітараў нашай рэспублікі. Іх выконвалі і прафесіянальныя артысты, і вучні музычных школ, і самадзейныя музыканты. Цікавымі былі творчыя сустрэчы з кампазітарамі Рыгорам Сурусам і Людмілай Шлег.

Вялікую работу па ўмацаванню творчых кантактаў праводзіць вядомы ўкраінскі кампазітар Багдан Клымчук. З яго дапамогай ствараюцца лекторыі і музычныя гасціныя, дзе гучаць расказы аб творчасці беларускіх кампазітараў, выконваюцца іх творы. У сваю чаргу ў Саюзе кампазітараў БССР слухачы сталіцы Беларусі пачулі камерна-вакальныя і камерна-інструментальныя творы Багдана Клымчука. У выкананні струннага квартэта БССР, саліста тэатра оперы і балета БССР, лаўрэата Усесаюзнага конкурсу імя Глінкі Міхаіла Жылюка, заслужанай артысткі рэспублікі Ларысы Максімавай, вучняў сярэдняй спецыяльнай музычнай школы пры Белдзяржкансерваторыі прагучаў струнны квартэт, фартэпіянныя мініяцюры, вакальныя цыклы кампазітара.

Н. ЗАХАРАВА.

У МІНСКУ АДКРЫЎСЯ НОВЫ ТЭАТР

ВЕСЦІ ГУТАРКУ НА МОВЕ МАСТАЦТВА

Новы прафесіянальны творчы калектыў з'явіўся сёлета ў Мінску — Дзяржаўны маладзёжны тэатр БССР. Свой першы сезон ён пачаў спектаклем па п'есе лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола Святланы Алексіевіч «Гэтыя незразумелыя старыя людзі...» паводле яе ж вядомай кнігі «У вайны не жаночы твар». На прыкладзе лёсаў герояў твора спектакль расказвае пра Вялікую Айчынную вайну.

Прэм'ера адбылася паўгода назад. За мінулы час са спектаклем пазнаёміліся не толькі мінчане, але і жыхары Віцебска, Бабруйска, Барысава, Вілейкі, іншых гарадоў. Галоўны рэжысёр тэатра Рыгор Баравік сказаў: «Калі па маёй прапанове акцёры прачыталі кнігу С. Алексіевіч, пытанне, з чаго пачне свой шлях маладзёжны тэатр, было вырашана аднадушна. Сёння я перакананы, што мы не памыліліся. Упэўнены, што тыя[illegible] бачыў наш спектакль, яшчэ[illegible] задумаюцца над важнымі праблемамі сучаснасці, вытокі якіх — у гераічным мінулым савецкага народа. Наша работа — не толькі даніна памяці велічнаму і самаахвярнаму подзвігу жанчын-франтавічак, гэта і зварот да сучаснай моладзі: што рабіць яна для таго, каб не парушылася святая сувязь пакаленняў».

Гледачы спадзяюцца, што ў новым годзе малады тэатр парадуе іх таленавітымі пастаноўкамі арыгінальных п'ес.

НА ЗДЫМКАХ: драматург Святлана АЛЕКСІЕВІЧ (на пярэднім плане справа) прымае віншаванні калектыву тэатра і ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны; акцёр Г. ВАЎЧОК, які ў спектаклі выконвае ролю бацькі Зінаіды; перад выхадам на сцэну акцёры Андрэй КАВАЛЬЧУК і Наталля ПАДВІЦКАЯ.

Фота У. КАВАЛЁВА.







ГАЛАСЫ СТАГОДДЗЯЎ

Папулярнымі сталі ў гродзенцаў вечары старадаўняй музыкі, якія праходзяць у залах рэспубліканскага музея атэізму і гісторыі рэлігіі. Пад старажытнымі скляпеннямі былога Базіліянскага манастыра гучалі ўжо творы вялікіх майстроў у выкананні ансамбляў старадаўніх інструментаў «Канчэнта» з Гродна і мінскага «Кантабіле», лаўрэата Міжнароднага конкурсу скрыпачоў імя Паганіні А. Крамарава.

Нядаўна ансамбль «Канчэнта», у якім іграюць выкладчыкі Гродзенскага музычнага вучылішча, правёў у залах музея цыкл вечароў з твораў Вівальдзі, Бакерыні, Тэлемана. Шырока ў канцэртах гродзенцаў прадстаўлены і рускія кампазітары— Бартнянскі, Фамін, Пашкевіч.

РЭПАРТАЖ СА СВЯТА, ЯКОЕ МАЕ АДБЫЦЦА

САМЫ ЖАДАНЫ ГОСЦЬ

І вось зноў ён хутка прыйдзе да нас... Ужо чуваць, як грукаецць дзвярыма, стрэсвае снег з валёнак: вось-вось пераступіць парог нашых дамоў. І мы радасна прыслухоўваемся да яго набліжэння. Ён — заўсёды чаканы госць. Хто ён? Безумоўна ж, Новы год!

Гэта радаснае, казачнае свята вельмі любімае ўсімі: і дзецьмі, і старымі, і ў вялікіх гарадах, дзе ў канцы снежня нават праз шалёны сучасны рытм прабіваецца такі чароўны запах хвоі, і ў вёсках, у якіх, здаецца, і нараджаецца навагодняя прыгажосць і непаўторнасць. Памятаеце, малюнкі свайго дзяцінства, дзяцінства вашых сыноў і дачок? Добры чараўнік Дзед Мароз выходзіць з заснежанага лесу з ёлкай, побач — вясёлыя зайчаняты, ваверкі, лісіцы, медзведзяняты...

Цяпер навагоднее свята прыходзіць да нас з прыгажуняй ёлкай, вясёлымі шумнымі вечарамі адпачынку, шматлікімі прафесіянальнымі і самадзейнымі канцэртамі, з музыкай, песнямі, танцамі, гульнямі і, канешне, чаканнем падарунка ад добрага Дзеда Мароза. Я хачу запрасіць вас, дарагія землякі, на адно з такіх святкаванняў. І хаця навагодняя ноч яшчэ наперадзе, варта прыкласці крыху намаганняў, і мы зможам сабе ўявіць, як будзе праходзіць сустрэча Новага года, напрыклад, на Нясвіжчыне, у вялікай вёсцы з паэтычнай назвай Высокая Ліпа.

Але спачатку давайце пазнаёмімся з вёскай.

Калі чалавек упершыню трапіць у Высокую Ліпу, ён абавязкова скажа: «Калі б не ведаў, што гэта вёска, падумаў бы, — іду па вуліцы невялікага горада: ад цэнтра разыходзяцца асфальтаваныя, па вечарах добра асветленыя вуліцы, насупраць вялікага клуба, пабудаванага яшчэ ў 1959 годзе (але такога, што і сёння многія зайздросцяць высакаліпцам), — навенькі гандлёвы цэнтр. У яго ўваходзяць і традыцыйны прадуктовы магазін, і прамтаварны, і кніжны, кулінарыя, кафэ. Крыху далей камбінат бытавога абслугоўвання. Тут мясцовыя жанчыны зараз шыюць сабе да свята прыгожыя, модныя сукенкі, прыйдуць рабіць прычоскі... Ёсць у камбінаце комплексны прыёмны пункт, пральня. Сучасная вясковая кабета не жадае траціць шмат часу на цяжкую хатнюю працу, якую можна даручыць і машынам, спецыяльным прыстасаванням. А вольная гадзіна ў Высокай Ліпе дарма не прападзе. Адзін толькі мясцовы клуб колькі цікавага прапануе: жанчын, дзяўчат чакае клуб «Гаспадыня», маладых механізатараў, даярак, паляводаў— клуб цікавых сустрэч «Сучаснік», аматараў песні — «Гранада», ёсць вакальныя, драматычныя, харэаграфічныя калектывы. Заходзьце ўсе, і кожны знойдзе сабе занятак па душы.

Але трэба вярнуцца (ці можа, наадварот, паспяшацца наперад?) бліжэй да навагодняга свята ў Высокай Ліпе.

Трыццаць першага снежня, і гэта ўжо стала традыцыяй, увесь дзень, а потым і ноч будуць расчынены дзверы Дома культуры. Сяльчане збяруцца тут на навагодні баль-маскарад. Многія прыйдуць у спецыяльна падрыхтаваных касцюмах. Загадчыца Дома культуры Ганна Гуцько «па сакрэту» сказала, што нават ужо ведае, як старанна рыхтуюць карнавальныя касцюмы жанчыны, што працуюць у камбінаце бытавога абслугоўвання, у некаторых брыгадах. Да таго ж іх трэба будзе яшчэ «абараніць». Як? Спецыяльна падрыхтаванымі песняй, вершам ці танцам, загадкай або проста вясёлым навагоднім жартам. З[illegible] лепшае выступленне найбольш [illegible]ціпных і вясёлых чакае ўзнагарода — навагодні сувенір.

Музыка, танцы, смех не змоўкнуць у сельскім клубе да самай раніцы. А [illegible] першы дзень новага года выса[illegible]пцаў, усіх членаў калгаса «1[illegible] верасня» чакае працяг свята на вуліцах і галоўнай плошчы вёскі. Дарэчы, да яго таксама загадзя вельмі старанна рыхтуюцца не толькі ў клубе, але і ў многіх калгасных хатах.

... У першы дзень студзеня з розных бакоў да Высокай Ліпы, цэнтральнай сядзібы калгаса, узнімаючы снежную заверць, паляцяць адмыслова ўпрыгожаныя сані, нават цэлыя санныя паязды з жыхарамі з ўсіх вёсак калгаса. З гармонікам, бубнам, яны праедуць, пройдуць па ўсіх вуліцах Высокай Ліпы, будуць спяваць, заходзіць у хаты, віншаваць землякоў з наступленнем Новага года. Асабліва прыгожа і маляўніча гэта, мабыць, атрымаецца ў вялікаліпцаў, якія стварылі свой фальклорна-этнаграфічны ансамбль. У яго рэпертуары мясцовыя, у тым ліку і калядныя песні. Праўда, сёння галоўнае — віншаванні, а гасцінцы па хатах збіраць не трэба, бо на цэнтральнай плошчы Высокай Ліпы, куды сцякаюцца рознакаляровымі шумнымі ручаінамі святочныя кавалькады, ужо чакаюць сталы з гарачымі самаварамі, духмянымі пірагамі — усё з пылу-жару (калгас мае свой уласны кандытарскі цэх, рэпутацыя якога вельмі высокая).

І вось ужо жадаючыя могуць паказаць, на што здатныя. Каля зззяючай ёлкі пачынаюцца конкурсныя навагоднія віншаванні, зноў танцы, гульні, традыцыйныя народныя спаборніцтвы, разгорнута выстаўка, дзе ўсе экспанаты зроблены рукамі мясцовых майстроў. Дзед Мароз, вельмі падобны да Юрыя Кальчыцкага, які працуе тут жа, на ферме, Снягурка, якая нагадвае сяльчанам маладзенькую прадаўшчыцу з мясцовага гандлёвага цэнтра, Несцерка, Паўлінка— усе стараюцца, каб не змаўкалі вяселле і смех.

А на заканчэнне ў р[illegible] Дзеда Мароза выступіць нават [illegible]мо праўленне калгаса. Дзякуючы яму, самы прыгожы і вясёлы санны поезд павязе ў свой вясковы клуб ці ў чырвоны куток на ферме каляровы тэлевізар або, можа, магнітафон...

І яшчэ кожны забяр[illegible] сабой шчодрыя, шчырыя пажа[illegible] і здзяйснення запаветных мар і надзей. А якія яны ў сённяшніх сяльчан, здагадацца няцяжка: каб дзеці раслі здаровыя і разумныя, зямля заставалася шчодрай, праца ладзілася, а ва ўтульным доме заўсёды быў дастатак.

Галіна УЛІЦЁНАК.



БЕЛАРУСКАЯ КУХНЯ

ГРЫБНАЯ ІКРА

Салёныя грыбы прапусціць праз мясарубку разам са смажанай рэпчатай цыбуляй, дабавіць перац, соль. Усё старанна перамяшаць. Прыгатаваную ікру пакласці горкай у салатнік і пасыпаць дробна нарэзанай зелянінай.

450 грамаў салёных грыбоў, 1 цыбуліна, 3 сталовыя лыжкі алею, зелянiна, перац, соль.

БЛІНЧЫКІ-ВЕРЧЫКІ

Спячы блінчыкі.

Начыніць тварагам, працёртым з цукрам і яйкам, скруціць у выглядзе рулета і пакласці на паэльню з тоўстым дном. Зверху заліць смятанай, змяшанай з падагрэтым маслам, закрыць і запякаць у духоўцы на працягу 20-30 мінут.

200 грамаў тварагу, 1 яйка, 1 сталовая лыжка цукру, 4 сталовыя лыжкі смятаны, 3 сталовыя лыжкі масла.

КАТЛЕТА «БЕЛАВЕЖСКАЯ»

Свіную карэйку (з косткай) парэзаць на кавалкі так, каб кожны з іх быў з косткай. Затым іх адбіць, костку зачысціць. На падрыхтаваныя адбітыя кавалкі карэйкі пакласці фарш, скруціць іх у выглядзе каўбаскі, намачыць у яйку, запаніраваць у сухарах, затым зноў у яйку і сухарах. Падрыхтаваныя каўбаскі абсмажыць у фрыцюры, паставіць у духоўку і давесці да гатоўнасці. Падаць са смажанай бульбай, марынаванымі грыбамі, зялёным гарошкам.

Прыгатаванне фаршу: вяндліну нарэзаць кубікамі, абсмажыць, дабавіць падсмажаную цыбулю, соль муку і зялёны гарошак, перамяшаць, абсмажыць і развесці булёнам да атрымання не надта густой масы.

500 грамаў свініны (карэйкі), 1 сталовая лыжка мукі, 60 грамаў шынкі, 2 сталовыя лыжкі малака, 80 грамаў зялёнага гарошку, 0,5 цыбуліны, 2 яйкі, 3 сталовыя лыжкі паніровачных сухароў, 3 сталовыя лыжкі топленага масла, соль.



БЕЛЫ СНЕЖАНЬ

Не так даўно гаспадарыў лістапад з яго пахмурнымі і мокрымі днямі, а нізкія халодныя хмары сеялі і сеялі макрэчу, слоту. А ўчора, як па загаду, надвячоркам падуў калючы халодны вецер і ачысціў небасхіл ад хмар. На захадзе выглянула скупое чырвонае сонца, і прабег марозік. У момант ён падсушыў вуліцу, падшэрхла зямля, пабялелі лужыны.

А на світанку зноў аднекуль нахлынула цёмная хмара і пасыпаў густы, вялікімі лапамі снег. Імгненна ўсё наваколле стала белае-белае, паветра чыстае, нават духмянае. У навакольнай цішыні было штосьці новае, загадкавае, чаруючае.

— Снежань крочыць упэўнена. Учора падсушыў зямлю, а сёння сыпле снег, каб добра ляжаў,— кажа сусед, які таксама выйшаў паглядзець пачатак зімы.

Але гутарку я не падтрымаў, бо захапіўся ўбачаным: на градзе, якая не паспела глыбока замерзнуць, крот рабіў на зіму тунелі, і таму на белым снезе чарнелі тры кучкі пяску; сінічкі заўзята скакалі з галінкі на галінку старой яблыні і час ад часу дзяўбалі ў шчыліны кары; сарока з-за будыніны прыгожа спланіравала на сметнік, каб паласавацца; чародка варон гойдалася на верхавіне разлажыстай ліпы, а крыху ніжэй, натапырыўшы крылы, нерухома сядзелі гілі і штосьці ціхутка гаманілі; вераб'і вылезлі з-пад стрэх, селі на плоце і чакаюць, калі насыплюць курам, каб да іх падсябравацца.

Мы выйшлі да Нёмна. Белае, яшчэ не кранутае слядамі пакрывала было разаслана да самай вады. Нёман, здаецца, прыцішыў свой імклівы бег, стаў задумлённы, нібы чакае, калі Дзед Мароз і яго накрые сваім цёплым пакрывалам.

— Ой! Якія ж прыгожыя і своеасаблівыя з'явы прыроды ў кожную пару года! Вось каб так было вечна!— прамовіў мой сусед.

Я. КРАМКО.



А мой без мяне кроку зрабіць не можа!



Кожнаму сваё.

НАШ АДРАС:

МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. 1969